Газета дзяржаўнай установы адукацыі “Грычынскі вучэбна-педагагічныкомплекс яслі-сад –базавая школа”



# Перапынак!



Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

№5
Студзень, 2021

## Чытайце ў нумары:

Аздараўленчы лагер "Снегавічок" стар. 2

Карысныя і цікавыя канікулы стар. 3

Заняткі бяспекі стар. 4

Зімовыя забавы стар.5

Весткі з дзіцячага сада стар. 6

# Аздараўленчы лагер “Снегавічок”

У чарговы раз школьны аздараўденчы лагер “Снегавічок” гасцінна расчыніў свае дзверы перад усімі жадаючымі. Былі сфарміраваны два атрады







Дзеці з задавальненнем удзельнічалі ў прапанаваных мерапрыемствах: спартыўных, творчых, інтэлектуальных. Яны даведаліся шмат новага і цікавага, навучыліся выраблять розныя падарункі, а самае галоўнае захавалі і ўмацавалі сваё здароўе










# Карысныя і цікавыя канікулы

Канікулы - цудоўны час, якога так чакаюць дзеці. Гэта слаўныя дзянькі, калі няма вучобы і, адсутнічае вострая неабходнасць  рана прачынацца. Але, як не дзіўна, на канікулах таксама варта пра сёе-тое паклапаціцца. І гаворка, безумоўна, не пра вучобу.  Кожнае дзіця, незалежна ад узросту і шырыні размаху планаў на канікулы, магло знайсці занятак па душы ў школе.











# Заняткі бяспекі

З 18.01.2021 па 29.01.2021 у нашай установе праходзіла дэкада пажарнай бяспекі. Асноўныя напрамкі дзейнасці ўключалі арганізацыю прафілактычнай і інфармацыйнай работы з навучэнцамі і іх бацькамі па прафілактыцы пажараў, навучанне правілам бяспечных паводзін. У кожным класе прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя супрацьпажарнай бяспецы.













# Зімовыя забавы

Нарэшце, прыйшла доўгачаканая зіма — з марозам і снегам, нарэшце, можна ўволю пакатацца з сябрамі на лыжах і санках, пагуляць у снежкі, паказаць сваё ўмельства і спрыт. Навучэнцы нашай школы з задавальненнем прымаюць ўдзел у прапанаваных мерапрыемствах. Яны спаборнічаюць на лепшага снежнага снайпера, на самага хуткага лыжніка, на самага крэатыўнага мастака. І хаця снег не вельмі лепіцца, гэта не шкодзіць ўдзельнікам атрымаць мора радасці і задавальнення. Доўга лётаюць снежкі, доўга гучыць дзіцячы смех. І так хочацца, каб гэты чароўны зімовы час працягваўся бясконца…















# Весткі з дзіцячага сада

*У студзені нам таксама не было часу сумаваць. Мы гулялі ў тэатр, рабілі доследы, вучыліcь пажарнай бяспецы, стваралі прыгожыя снежныя фігуры на нашай пляцоўцы.*











